Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі
_______________Р.С. Сідарэнка

«18» снежня 2018 года

ТРЭЦІ ЭТАП XXXV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**11 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

## Варыянт І

**Заданне 1.** У табліцы пададзены восем слоў, у кожным з якіх прапушчана адна з трох літар – ***е***, ***ё*** або ***я***. Вызначце гэтыя літары і запішыце іх у слупку справа насупраць адпаведных ім слоў.

*Максімальная колькасць балаў – **4*** (**0,5** бала – за кожны правільны адказ).

| | | | |
|---|---|---|---|
| *гелі…цэнтрычны* | | *рады…метрыя* | |
| *крышталі…оптыка* | | *ус…ўладны* | |
| *рады…лагічны* | | *рады…сетка* | |
| *ус…ахопны* | | *ус…міласцівы* | |

**Заданне 2.** У левым слупку табліцы прыведзены фрагменты шасці фразеалагізмаў. Дапоўніце кожны з іх прапушчаным кампанентам, кіруючыся змешчаным побач значэннем фразеалагізма. Запішыце гэты кампанент у патрэбнай граматычнай форме ў трэцім слупку адпаведнага радка. Прапушчаныя кампаненты ўсіх фразеалагізмаў па форме павінны быць суадноснымі з прыметнікамі, сярод якіх, паводле свайго першаснага значэння, па два якасныя, адносныя і прыналежныя.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | |
|---|---|---|
| адгароджвацца … сцяной | *‘вельмі моцна, наглуха адасабляцца, адмяжоўвацца ад каго-, чаго-н.’* | |
| … прыцэл | *‘хітры разлік, прыхаваныя задумы, планы, намеры’* | |
| як з … яйкам [цацкацца, няньчыцца] | *‘залішне многа і далікатна’* | |

| | | |
|---|---|---|
| … ніць | *‘сродак выйсці з цяжкага становішча’* | |
| варона ў … пёрах | *‘чалавек, які марна імкнецца паказаць сябе лепшым, больш значным, чым ён ёсць на самай справе’* | |
| … гадзіна | *‘час, калі пачынае цямнець, на стыку дня і ночы; прыцемак’* | |

**Заданне** 3. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў* – **5**.

Окна в деревянном доме под железной ржавой крышей были темны, на крик никто не отозвался. Красильщиков замотал на щиток вожжи, поднялся на крыльцо вслед за вскочившей туда грязной и мокрой собакой, – вид у нее был бешеный, глаза блестели ярко и бессмысленно, – сдвинул с потного лба картуз, снял отяжелевший от воды армяк, кинул его на перила крыльца, затем вытер пестрое от грязных брызг лицо и стал счищать кнутовищем грязь с голенищ *(По И. Бунину)*.

**Заданне 4.** Падрыхтаваўшы навукова-даследчую працу па тэме “Словаўтварэнне”, вучань вырашыў падвесці вынікі ўласным назіранням і сфармуляваў некалькі тэарэтычных палажэнняў-высноў. Ці ўсе яны аказаліся слушнымі? Адзначце правільныя, на вашу думку, сцверджанні знакам “+”, а памылковыя – знакам “–”.

*Максімальная колькасць балаў* – **5** (**0,5** бала за кожны правільны адказ).

| №<br>п/п | Тэарэтычная выснова | + / – |
|---|---|---|
| 1. | Слова можа быць утворана пры дапамозе двух суфіксаў. | |
| 2. | Усе складаныя словы маюць не менш як два корані. | |
| 3. | Да кожнага вытворнага слова можна падабраць утваральнае. | |
| 4. | Назоўнікі не маюць постфіксаў. | |
| 5. | Усе парадкавыя лічэбнікі з'яўляюцца вытворнымі. | |
| 6. | Усе словы з нулявымі суфіксамі з'яўляюцца вытворнымі. | |
| 7. | Слова можа быць утворана пры дапамозе дзвюх прыставак. | |
| 8. | Усе словы без суфіксаў з'яўляюцца невытворнымі. | |
| 9. | Корань – абавязковая частка кожнага слова. | |
| 10. | Канчатак не з'яўляецца словаўтваральным сродкам. | |

**Заданне 5**. Сярод часцін мовы даволі пашыраныя з'явы граматычнай аманіміі і мнагазначнасці, а таксама ўзаемапераходу. Гэта характэрна як для самастойных, так і для службовых часцін мовы, з чым нярэдка звязаны цяжкасці іх марфалагічнай і сінтаксічнай характарыстыкі.

Запішыце, якімі часцінамі мовы і членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы ў прыведзеных прыкладах?

*Максімальная колькасць балаў – 4* (**0,25** бала за кожны правільны адказ).

1) Варта задумацца над тым, **як** вывесці гаспадарку ў перадавыя. 2) Па небе хмары, **як** палотны, паўночны вецер рассцілае. 3) Да каго ж мне звярнуцца, **як** не да вас? 4) **Як** радасна, край малады, цябе сягоння прывітаць! 5) Бацькі былі ўсцешаны тым, **што** дзеці сталі на свае ногі. 6) **Што** з воза ўпала, тое прапала. 7) Больш за ўсё непакоіла думка: а **што**, калі хлопец не прыедзе? 8) **Што** так прыцягвала людзей у гэтых мясцінах?

| № п/п | Часціна мовы | Член сказа |
|---|---|---|
| 1. | | |
| 2. | | |
| 3. | | |
| 4. | | |
| 5. | | |
| 6. | | |
| 7. | | |
| 8. | | |

**Заданне 6**. Запішыце тэкст, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. У апошнім сказе вызначце колькасць сэнсава-граматычных частак.

*Максімальная колькасць балаў – 5*
(з іх **1** бал за правільнае вызначэнне колькасці частак
у складаным сказе; за кожную памылку здымаецца **0,5** бала).

Над лугам *(па)* волі *(н..)* спешна ўставала сонца. Яно падыма..чыся з травы *(у)* вачаві..кі больш..ла здавалася шчодра ра..пуска..цца вялікі бутон нейкай *(ярка)* пун*(с,ц)*овай краскі.

*(У)* весь ніз сонца быў у буйн*(о,а)*й і чыстай як слёзы расе. Раса ззяла пералівалася іскрылася і Верасоўскаму які глядзеў на ўсё гэта нават *(не)* падыма..чы галавы здавалася што расінкі перапоўне*(н)*ныя сонечнымі промнямі вось зараз у гэтую хвіліну нібы напухлыя пупышкі пачнуць лопацца ад лішкаў святла.

Зараз узняўшыся над травою сонца было чыстае увесь луг з..хацеў бл..скучымі і звонкімі жнівен*(ь)*скімі пацеркамі. Праз якую хвіліну сонца ўжо *(не,ні)* стала відаць яно бы*(тц)*цам знікла ра..тварылася ў сва..м жа святле і толькі на тым месц.. дзе яно ўзы*(й)*шло гэтак ярка і сляпуча гарэла цэлае *(паў)* неба што ў той бок *(не)* магчыма было глядзець. *(Паводле Я. Сіпакова)*

**Заданне 7.** Расшыфруйце *хэштэг*[1]*-выказванне*, запісаўшы яго ў адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай мовы і адкажыце на пытанні:

1. У форму якога сказа “апранута” арыгінальныя павучальныя думка? (Тып сказа.)
2. Якую ролю выконвае прабел на пісьме?
3. Каму належыць гэты афарызм?

**Памятайце!** У *хэштэгу* выкарыстоўвацца як кірылічны, так і лацінскі алфавіт; словы запісваюцца без прабелаў і знакаў прыпынку.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

#ČASLUSTERKAUJAKIMKOŽNYŬBAČYĆSIABIEJAKJIINŠAHA

**Правільны адказ:** ______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 8.** Пазнайце па апісанні героя мастацкі напрамак, у межах якога такі герой дзейнічае (пералік напрамкаў пададзены ў даведцы; улічыце, што ў гэтым пераліку ёсць “лішнія”). У адпаведную графу пастаўце нумар пераліку жанраў, найбольш характэрных для гэтага мастацкага напрамку (пералік жанраў пададзены ў даведцы).

*Максімальная колькасць балаў – **4**.*

| Апісанне героя | Мастацкі напрамак | Нумар пераліку жанраў |
|---|---|---|
| Герой – тыповы прадстаўнік пэўнай сацыяльнай групы, носьбіт ідэі, надзелены індывідуальнасцю, дзейнічае ў тыповых абставінах. | | |

[1] **Хэштэг** (ці *хэш-тэг*) – спалучэнне сімвала (#) са словам ці спалучэннем некалькіх слоў, запісаных без прабелу, якое выкарыстоўваецца для пошуку інфармацыі ў інтэрнэце па пэўнай прымеце ці тэматыцы.

| | | |
|---|---|---|
| Герой перажывае канфлікт паміж грамадскім абавязкам і асабістымі пачуццямі, падпарадкоўвае сябе служэнню высокім ідэалам. | | |
| Герой засяроджаны на ўнутраных перажываннях, уласных пачуццях. Ён далёкі ад грамадскіх пераўтварэнняў, вызначаецца душэўнымі якасцямі, багатым унутраным светам. | | |
| Герой-бунтар, дваісты па сваёй сутнасці, самотны шукальнік, часта мае трагічны лёс. | | |

ДАВЕДКА

**Жанры**: **1.** трагедыя, ода, камедыя, байка; **2.** элегія, пасланне, аповесць; **3.** сацыяльна-бытавы раман, аповесць, апавяданне, эпічная паэма; **4.** паэма, балада, песня, гістарычны раман.

**Напрамкі:** *барока, сентыменталізм, класіцызм, рамантызм, мадэрнізм, постмадэрнізм.*

**Заданне 9**. Вы ведаеце, што ў Беларусі 2019 – Год малой радзімы. Упішыце ў табліцу нумары назваў твораў і месцаў, звязаных з малой радзімай (вобласцю, дзе нарадзіліся, выраслі) мастакоў слова, указаных у табліцы. Улічыце, што некаторыя назвы не адносяцца да названых тут пісьменнікаў.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | |
|---|---|
| *Максім Танк* | |
| *Аркадзь Куляшоў* | |
| *Янка Брыль* | |
| *Іван Мележ* | |
| *Уладзімір Караткевіч* | |
| *Яўгенія Янішчыц* | |

**Назвы мастацкіх твораў і тапонімаў:**

**1.** Верш «Мая Бесядзь»
**2.** Вёска Загора
**3.**Драма «Званы Віцебска»
**4.** Паэма «Нарач»
**5.** Вёска Малая Багацькаўка
**6.** Вёска Глінішчы
**7.** Раман «Подых навальніцы»
**8.** Аповесць «Сірочы хлеб»
**9.** Паэма «Свіцязянка»
**10.** Паэма «Ягадны хутар»
**11.** Трылогія «На ростанях»
**12.** Вёска Пількаўшчына
**13.** Вёска Рудка
**14.** Вёска Саматэвічы
**15.** Горад Орша

**Заданне 10**. Аднавіце аўтарскі тэкст – выберыце з даведкі 5 адпаведных па стылі і сэнсе эпітэтаў і ўпішыце іх у сказы. Пры неабходнасці змяняйце граматычныя формы слоў.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

З яснаватай, прарэзанай у навале цяжкіх хмар шчыліны дыхала ____________ холадам. На падсушаную замаразкам зямлю ____________ макам церушыўся поцемак.

Глыбокая, як вада ў патоп, цемната залівала равы і лагчыны. На балоце гінуў і тапіўся ў ёй малады сіняваты алешнік.

Чарнела, зліваючыся з рудою раллёю, зялёная рунь на грудах. Толькі ____________ палатном слалася ____________ пясчаная дарога. Вецер дзёр на ёй і гнаў у вёску сухі горкі пясок – здаецца, яго паднімала, вырываючыся і б'ючыся адным крылом, вялікая ____________ птушка.

*Паводле Вячаслава Адамчыка*

**Даведка**: *аеравы, чэрствы, азыраваты, драўляны, нявыбелены, падбіты, драбнюткі, гучны.*